Няхай жа маладыя сілы паложаць канец тэй агідзе, якая так распанашылася за апошнія гады ў нашым грамадзянстве!

## Пісьмо ў рэдакцыю

Паважаны грамадзянін Рэдактар!

Дзеля таго, што ўсялякае баламучаньне грамадзянства лічу за рэч шкодную, незалежна ад мэты, для якое гэта робіцца, мушу прасіць Вас падаць да агульнага ведама на старонках Вашае паважанае часопісі наступную маю заяву.

Няведамае мне польскае прэсавае агенцтва WAPL разаслала 18.IX.1931 г. „Палітычны бюлетэнь“, у якім зьмешчана толькі адна заметка пад назовам „Зьмены сярод беларусаў“, пасьвячоная цалкам і выключна маей асобе. На самым пачатку гэтага паведамленьня гаворыцца:

„Выдатны дзеяч і нацыянальны павадыр беларусаў, які стала жыве ў Вільні, праф. Антон Лучкевіч[1], з прычыны завастрэньня проціберарускага курсу, які бальшавікі праводзяць на тэрыторыі ўсяе Меншчыны[2], *рашуча выказаўся на карысьць палянафільскага курсу“*.

З увагі на тое, што прозьвішча маё перакручана, я сьпярша ня мог пазнаць сябе ў гэтым, *бо я на гэту тэму нідзе не выказываўся*. Толькі з далейшага зьместу камунікату, дзе гаворыцца аб маей працы ў Беларускай гімназіі ў Вільні, а такжа аб пэўных мамэнтах з маей мінуўшчыны, я зразумеў, што гутарка йдзе аба мне.

Ня буду рэагаваць на іншыя няточнасьці, зьмешчаныя ў камунікаце, але гэтае першае часткі не магу пакінуць без адказу, бо ж яна мае яўна правакатарскі характар.

У сучасных варунках, калі на беларускае школьніцтва ў польскім гаспадарстве сыплюцца балючыя ўдары, калі беларуская праца наагул сустракаецца з чысьленымі перашкодамі з боку адміністрацыйных уладаў, падобнае выступленьне, якое прыпісывае мне таямнічы камунікат, сьведчыла б ня толькі аб адсутнасьці ў мяне пачуцьця асабістае і нацыянальнае годнасьці, але такжа і аб поўным заніку палітычнага змыслу. Мэта гэтага баламуцтва аж залішне ясная...

Што ж датычыць абходу 25–лецьця маей публіцыстычнай працы, які, паводле камунікату WAPL, мае адбыцца ў гэтым месяцы, дык лічу, што ў гэткі цяжкі мамэнт беларускае грамадзянства не аб юбілеях думаць павінна, а аб ахвярным высілку дзеля перарывання і перамаганьня труднасьцяў, якія ўсьцяж вырастаюць на нашым шляху да лепшае будучыны.

З пашанай

*Антон Луцкевіч.*